МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ПАСТАНОВА

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

26.06.2025 № 69

г. Мінск

г. Минск

Аб наданні статусу і катэгорый
гісторыка-культурным каштоўнасцям

На падставе часткі першай пункта 1 артыкула 93, пункта 4 артыкула 96 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, абзаца другога падпункта 5.13 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, рашэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2025 г. № 04-01-02/3, Міністэрства культуры ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Надаць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і:

катэгорыю "3" будынку Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра з дэкаратыўным аздабленнем інтэр'ера па вул. Маставая, 35 (інв. № 400/С-25232) у г. Гродна Гродзенскай вобласці;

катэгорыю "3" аб'екту "Памятная стэла з мазаічным пано "Першаадкрывальнікам беларускай нафты", размешчанаму на 55-м км трасы Гомель-Калінкавічы (100-м км аўтадарогі М-10) у Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці;

катэгорыю "3" аб'екту "Археалагічны комплекс Рэчкі" канца I тыс. да н.э. – пачатку II тыс.н.э., размешчанаму ў лесе на адлегласці ад 0,5 да 1,5 км на ўсход ад в. Рэчкі Вілейскага раёна Мінскай вобласці;

катэгорыю "Б" элементу "Практыкі захавання народных традыцый і культурнай памяці ў творчасці Івана Супрунчыка" ў Столінскім раёне Брэсцкай вобласці;

катэгорыю "Б" элементу "Шчадраванне з Жарэбнай Кабылай" у аграгарадку Лазавічы Клецкага раёна Мінскай вобласці.

2. Гэта пастанова ўступае ў сілу пасля яе падпісання.

Першы намеснік Міністра Д.Г.Шляхцін

Зак. 1335